**Т. М. Ігнацюк (г. Брэст, Беларусь)**

# ЖЫЦЦЁ І ІДЭАЛОГІЯ Ў РАМАНЕ І. МЕЛЕЖА «ЛЮДЗІ НА БАЛОЦЕ»

“Палеская хроніка” Мележа ўвабрала ў сябе жыццёвы вопыт мастака, уражанні дзіцячай, асабліва памятлівай душы. Твор нарадзіўся з патрэбы пісьменніка расказаць пра тое, што для яго было родным, дарагім, у чым бачыў паэзію і хараство і пра што адчуваў неабходнасць

расказаць: “Выпускаючы кнігу ў свет, я хацеў выканаць свой сыноўні абавязак перад бацькоўскай зямлёй, перад роднымі людзьмі; яна невыпадкова пачынаецца прысвячэннем – “*Бацьку, маці, бацькоўскай зямлі*” [3, т. 8, с. 222–223]. Менавіта таму раман “Людзі на балоце”, прысвечаны бацькам, стаў кнігай любві да радзімы, да роднай зямлі.

Праз усю творчасць упарта і настойліва Мележ “цярабіў дарогу” да гэтага твора “Палескай хронікі”, у якой на поўны голас заявіла аб сабе сялянская тэма, традыцыйная і актуальная для беларускай літаратуры. Мележ звяртаўся да мінулых дзесяцігоддзяў, да лёсу сялянства ў пераломныя моманты гісторыі, каб глыбей зразумець сучасніка. “Мне хацелася паказаць, – тлумачыў ен, – як няпроста нараджалася новае жыццё, як нялёгка, у змаганні і пакутах, нараджаўся новы чалавек” [2, с. 216]. Трэба было, інакш кажучы, па-мастацку адлюстраваць гісторыю свайго народа, паказаць працэс нараджэння і фарміравання новага чалавека, які перарабляе жыццё пад кіраўніцтвам партыі па сацыялістычных законах, які дзейнічае ў новых абставінах, калі людзі, пераадольваючы чалавечае адчужэнне, назаўсёды развіталіся з “быльнікавымі межамі”. Па-мастацку спасцігнуць і раскрыць гэты працэс аказалася справай вельмі нялёгкай.Пісьменнік паказвае падзеі, якія маюць важнае грамадскае значэнне, уцягваюць герояў рамана ў сацыяльна значныя ўзаемаадносіны. Аўтар таксама не ідэалізуе мінулае, ён з ўсёй перакананасцю і прынцыповасцю малюе і тое агіднае, што калечыла людзей, іх лёсы, паказвае адмоўнае ў сацыяльных адносінах, побыце, звычаях: “Я хацеў паказаць, як старыя законы калечаць сэрцы і душы, раскрыць антыгуманнасць і бесчалавечнасць гэтых законаў…” [2, с. 217].

Паказаць жыццё куранёўцаў сярод “вялікага свету”– гэтая задача прымусіла аўтара перанесці падзеі рамана ў раённы цэнтр, а затым у сталіцу: “Каб паказаць жыццё як складаны гістарычны паток, у якім вірують розныя плыні,я павінен быў паказаць яго з розных пунктаў, на розных ўзроўнях. Так, у другі раман увайшлі раздзелы пра местачковы побыт, пра дзейнасць раённых кіраўнікоў, пра чыстку партыі, пра сесію ЦВК БССР, што абмяркоўвала пытанні калектывізацыі беларускай вёскі. Імкненне паказаць жыццё шырока і разнастайна патрабавала вывесці на першы план асобу, у якой маглі б сканцэнтравацца супярэчлівыя павевы паваротнага часу. Такой асобай стаў старшыня райвыканкама Апейка, які быўледзь намечаны ў “Людзях на балоце”, – вобраз надзвычай важны для мяне” [2, с. 409]. Свае развагі пра Палессе і палешукоў пісьменнік давярае Апейку – аднаму з любімых герояў, які ўспамінае напісаныя пра палескі край кнігі: “*Ён чытаў іх усе, якія мог дастаць. Некалькі талковых кніг пра прыроду – пра лясы, балоты, пра птушак, пра звяроў; некалькі зборнікаў – запісаў казак, песень ды звычаяў. З іх маляваўся воблік народа: ціхія, дзікія, у палоне забабонаў. У тым таксама было нямала праўды, але як далека*

*было да вялікай праўды! Як мала – пра бязмежна багатае людское мора, імя якому – народ!..*” [3, т. 6, с. 376].

Раман“Людзі на балоце” адкрываецца апісаннем незвычайнага вострава, лапіка зямлі сярод суцэльнага мора балот, на якім прытулілася вёска Курані. Спачатку перад чытачом паўстае яе агульны выгляд у розныя поры года. Так, праз пейзажнае апісанне аўтар знаёміць чытача з часам і месцам дзеяння. Пісьменніку ўсё тут міла і дорага; яго захапляе працоўная рупнасць, з якой куранёўцы пачынаюць дзень, таму ён выкарыстоўвае шмат эмацыянальна-ацэначных эпітэтаў: *“віліся ціхія дымочкі”, “чысты і працавіты клёкат железа”, “звонкі ляск пугі”, “журавель задаволена, радасна зарыпеў”* і інш. Жыццё людзей нияркае, аднастайна-шэрае, з чаго, па сутнасці, і складаецца жыццё тысяч і мільёнаў людзей, моцна прывязаных да зямлі. Дні кожнага жыхара перапоўнены неадкладнымі справамі, клопатамі, якія паўтараюцца з года ў год: своечасова скасіць сена на гіблым балоце, зжаць неўрадлівае жыта і змалаціць яго ўручную, цапамі, і назбіраць грыбоў у лесе і ягад на тым жа балоце. Каб падкрэсліць, як цяжка жывецца тут чалавеку, аўтар выкарыстоўвае такія эпітэты: *“панурыя лясы”, скупыя няўдзячныя палі”, “замшэлыя рады стрэх”, “нудныя дажджы”*.

Ва ўкладзе жыцця куранёўцаў знайшлі адлюстраванне самыя старажытныя – язычніцкія – уяўленні чалавека пра навакольны свет, пра жыццё людзей, пра прыроду. Трываласць гістарычнай памяці адчуваецца ў імёнах і мянушках герояў: *Корч, Сарока, Пракоп Лясун, Грыбок, Зайчык, Руды, Кныш* і інш. Аўтар такім чынам захаваў эстэтыку фальклору, паказаў гісторыю не аднаго пакалення людзей, лад іх жыцця, які патрабуе да сябе паважных адносін. Мова куранёўцаў таксама радуе і здзіўляе сваім каларытам: *“мамо”, “цётко”, “братко”, “жыто”, “ето”, “дзераво”*. У звароце да мясцовага слова і выразу няма нічога штучнага – яны ўспрымаюцца вельмі натуральна.

Вёска, адарваная ад свету непралазнымі балотамі, жыве старымі забабонамі. На вячорках дзяўчаты сур’ёзна расказваюць пра ведзьмакоў, і большасць гэтаму верыць. Кожны чалавек жыве пераважна сваімі клопатамі, дбае пра сябе, пра свой дабрабыт. Усё гэта традыцыйнае, спрадвечнае; так жылі дзяды і прадзеды, і гэта было прывычна. Савецкая ўлада ўнесла і штосьці новае – ідуць размовы пра перадзел зямлі. Кожны бядняк спадзяецца атрымаць лепшы кавалак зямлі і стараннай працай, ашчаднасцю выбіцца нарэшце з галечы. Не так упэўнена адчувае сябе кулак Глушак; ён паддобрываецца да аднавяскоўцаў, трымае сябе з імі лагодна. Глушак не хоча, але вымушаны лавіраваць: бясплатна малоціць жыта старшыні сельсавета Дубадзелу. Мачыха Ганны кажа: “*Тут своя выгада! Начальство!.. Я – табе, ты – мне... Я табе памалачу, а ты мне аддзячыш сваёй ласкай. Падатак там збавіш ці шчэ што...*” [4, с. 72].

Яго сын Яўхім больш прамалінейны. Ён не хавае адносін да таго новага, што прынесла ў вёску Савецкая ўлада. Яўхім шукае падтрымкі ў бандытаў, якія пагрозай смерці хочуць выбіць з сялян надзею на пераўтварэнні ў весцы. Напрыклад, Маслак прыходзіць да Грыбка, каб пакараць яго: "*– Не вінны, кажаш? А перадзел зямлі хто захацеў? – Не я. Сход рашыў... – Слухай! Перадзел атаман Маслак адмяняе!... Запомні, калі хочаш дзетак бачыць! Ясна? – Ясно... Але ж сход... – Калі будзе перамер, заказвай труну! – павысіў голас бандыт. – загадзя лажыся! – Браткі, дак хіба ж я адзін... – І другім перадай! Хай таксама, калі жыць неахвота, закажуць!*" [4, с. 42–43]. Так, на некаторы час бандытам удалося запалохаць куранёўцаў, але павольна сам селянін пачынае мяняцца. З ходам сацыялістычных пераўтварэнняў у селяніна пачынаюць складвацца новыя рысы характару. Моладзь пачынае крытычна ставіцца да спрадвечных уяўленняў – веру ў Бога і ведзьмакоў.

Узнікае пачуцце чалавечай годнасці і грамадзянскасці ў Васіля. "*Уся сіла чалавека – у зямлі, – разважае Васіль. – І сіла ўся, і радасць! Няма зямлі – няма, лічы, і чалавека*" [3, т. 6, с. 327]. І мы чуем, што за гэтым стаіць праўда жыцця, якую адчуў не толькі беларускі пісьменнік. У Васілю спалучыліся і працаўнік, і ўласнік. Яшчэ з маленства ён ведаў: "*...Жыцце – не вясёлае, бесклапотнае свята, а найбольш доўгі і клопатны будзень, што трэба цярпець... Усім цяжка бывае, усе церпяць, цярпі і ты*" [3, т. 5, с. 20]. Як і ў многіх сялян, у Васіля, з аднаго боку, прысутнічае працавітасць і чэснасць, а з другога – індывідуалізм, сацыяльная індыферэнтнасць. Гэта адчувае добра Апейка, старшыня валвыканкама. У размове з Васілём ён выказвае свой погляд на сялянства: "*Для вас, для вашага шчасця стараюцца, гінуць людзі. А вы, вы – за сябе пастаяць не ўмееце!... Ты – не бандыт, ты – крот, які капаецца ў сваёй нары. І толькі адну сваю шкуру беражэ. А там – хоць трава не расці! Хай другія прынясуць табе шчасце на талерачцы!..*" [3, т. 5, с.114]. Старшыня валвыканкама Апейка мае ўсе падставы думаць, што Васіль Дзятлік належыць якраз да тых, для каго і была здзейснена Кастрычніцкая рэвалюцыя, таму што Васіль нясе на сабе груз перажыткаў старога ўласніцкага ладу.

Апейка ўвасабляе ў творы Савецкую ўладу і Камуністычную партыю. Ён абвяргае і развенчвае перакананні Васіля аб тым, што няма праўды. Ёсць праўда! Савецкая ўлада выступае ахоўніцай праўды і справядлівасці. Папракаючы Харчова за несправядлівасць, праяўленую да Дзятліка, Апейка гаворыць: "Але што мы за такая Савецкая ўлада, калі нас баяцца павінны?" [4, с. 105].

Сацыялістычная законнасць для Апейкі – рэальнае паняцце; без яе немагчыма будаўніцтва новага жыцця. Зыходзячы з гэтага, ён вырашыў патрэбным умяшацца ў гісторыю з маладым паэтам Алесем Маевым, якога беспадстаўна аб'явілі нейкім "паслугачом нацдэмаўскага ахвосця".

Апейка – чалавек цывільны, ён менш афіцыйна, чым Харчаў, ставіцца да людзей. Ён не церпіць абыякавых, чыноўніцкіх адносін да людзей, умее перажыць чужую бяду, як сваю ўласную, ва ўсім імкнецца кіравацца сумленнем камуніста, патрабавальнай любоўю да людзей. Гэта мы бачым і ў яго гаворцы: *"Апейка мяккім голасам пастараўся растлумацычь"* [4, с. 105]; *"...ціха, але ўпарта прамовіў Апейка"* [4, с. 104]; *"...Ціха, мякка запярэчыў Апейка тонам старэйшага, які абавязаны паправіць, растлумачыць"* [4, с. 104]. Яму важна, каб пад арыштам не трымалі невіноўнага. Таму ён праяўляе партыйную прынцыповасць і настойлівасць, каб Харчаў не проста выпусціў, а зразумеў сваю памылку.

Змаганне за чалавека – арганічная патрэба камуніста Апейкі, і ў гэтым выяўляецца яго вернасць ленінскім прынцыпам кіраўніцтва масамі. Апейка заўсёды не дыктуе, не загадвае, а кожны раз пераконвае. Ён добра ведае людзей, з якімі працуе, прадбачыць рэакцыю на сваю прапанову і загадзя думае, як пераканаць куранёўцаў да важнай справы – пабудовы грэблі: "*Канешне, можна і так пакінуць, як было, – загаварыў ён, калі гоман аціх, – можна не рабіць грэблі. Можна абысціся, як тут хтосьці казаў. Бацькі і дзяды жылі без яе, праўда. Сядзелі ў балоце, у твані, не было запалак, керасіны – абыходзіліся і без хлеба. Кары, жалудоў, дзякуй Богу, удосталь. Анігадкі жылі бацькі і дзяды, як паны жылі! Душыліся дымам, пухлі з голаду, мерлі без помачы. Калі ж вельмі прыпякала, прабіваліся і цераз гэту душагубку*" [4, с. 139]. Апейка разумее, што калектывізацыя здзяйсняецца ў інтарэсах селяніна, даючы яму перспектыву свабоднага развіцця – адзіна магчымае выйсце з тупіка прыватнага ўласніцтва. Ён усё робіць для таго, каб сяляне праніклія разуменнем гуманістычнага сэнсу калектывізацыі.

Вобразам Апейкі аўтар сцвярджае свой ідэал снаноўчага героя. Апейка – актыўны, свядомы ўдзельнік гістарычнага працэсу; ён народжаны часам, які змясціў у сабе рэвалюцыю, грамадзянскую вайну, пераломную эпоху калектывізацыі і многае іншае. Гэта сапраўды эпічны герой, у якім адлюстраваліся цэлыя пласты народнага вопыту. Вострыя класавыя сутычкі 20–30 гадоў патрабуюць ад яго пільнасці, напружання сіл, і адначасова загартоўваюць характар, вучаць партыйнаму погляду на жыццё. Апейка добра разумее: многае залежыць ад таго, якімі будуць людзі, што павядуць палешукоў да новага. Ён вучыць Міканора нялёгкай рабоце з людзьмі: *"А ты не сілаю, а свядомасцю старайся браць. Актывістаў арганізуй, каб памаглі. Падбяры групу талковых сумленных, пагавары шчыра. Падымі іх над балотнай тванню, выведзі з царства затхласці, пакажы – што навокал робіцца, што наперадзе будзе! Ты ж бачыў многа сам, ведаеш нямала! Зацікаў жа другіх, запалі іх!"* [4, с. 182]. Апейка вучыць куранёўскага актывіста паважліва ставіцца да людзей, верыць

у іх, не шкадаваць ні працы, ні часу, каб яны зразумелі перавагі новага. Ён добра бачыць слабасці Міканора і тактоўна папраўляе апошняга.

Жыццёвую загартоўку Міканор атрымаў у Чырвонай Арміі. Там ён адкрыў для сябе вялікую праўду рэвалюцыі, натхніўся высокімі ідэаламі камуністаў дабіцца шчасця для ўсіх працоўных людзей. У арміі ён стаў камсамольцам. Ён адмовіўся ад спакуслівай перспектывы стаць кадравым вайскоўцам, таму што вырашыў вярнуцца ў родную веску, каб ладзіць там з сялянамі новае жыццё. Першы куранёўскі камсамолец жыве марай перайначыць вясковы быт, пабудаваць клуб. Яму, як былому вайскоўцу, характэрна грамадская актыўнасць, адчуванне асабістай адказнасці за тое, што робіцца ў весцы. Яго клопаты звязаны з грамадскімі праблемамі; яны выяўляюць няўрымслівасць яго натуры, грамадскую актыўнасць і сталасць. Міканор ведае, што са старым трэба змагацца, бо яно само не знікне, не саступіць месца новаму, разумее, што барацьбу супраць коснасці ў Куранях павінен пачаць ён. Міканор словам і асабістым прыкладам імкнецца запаліць куранёўцаў жаданнем ладзіць новы быт, новыя парадкі.

За ўсё, за што бярэцца куранёўскі важак, ён робіць з поўнай аддачай, радуецца праявам прагрэсу ў роднай вёсцы, у жыцці сваіх землякоў: *"І нашы куранёўцы не горай за другіх, – плылі паволі думкі Міканора, – і з нашымі можна рабіць... Абы толькі падняць ды павесці... а так яны пойдуць... Людзі як людзі...Нічога, мы шчэ пакажам з етымі людзьмі!.."* [4, с. 200]. Будаўніцтва грэблі – своеасаблівая школа для куранёўскага важака, школа ўмення кіраваць людзьмі і весці іх за сабой. Ён сам разумее, што гэтага ўмення яму не хапае: *"Не трэба было так кідацца, мягчэй трэба было"* [4, с. 197]. Даследчык Д. Бугаёў адзначаў, што *"вялікая сацыяльная актыўнасць Міканора, якая складае яго галоўную сілу, мае адзін досыць выразны адмоўны аспект. Міканору ў яго практычнай дзейнасці яўна не стае цярпення паслядоўна заваёўваць адну пазіцыю за другой, весці за сабою сілай прыкладу, разумнага, па-чалавечы тактоўнага і ўдумлівага растлумачвання пераваг новага жыцця. З-за сваёй гарачлівасці ён недастаткова гнуткі ў метадах і прыёмах работы, не заўседы лічыцца са складанасцю і супярэчлівасцю сялянскай псіхалогіі, а таму часта забягае наперад, выклікаючы насцярожаную недаверлівасць куранёўцаў, выказаную ў трапных словах бойкай Сарокі: "Каб не выбраць халеру –гарачы не ў меру!". Міканор сумуе па вайсковых парадках, дзе ўсё рашае безагаворачны загад"* [1, с. 114–115].

Раман Мележа сваім зместам выходзіць за часовыя межы перыяду калектывізацыі. Даследуючы рэчаіснасць і чалавека, які фарміраваліся стагоддзямі, аўтар раскрывае духоўнае багацце асобы, тыя маральныя якасці чалавека, якія праяўляюцца і сцвярджаюцца ў працэсе яго пераўтваральнай грамадскай дзейнасці. Мы бачым, як няпроста даюцца чалавеку пошукі свайго месца ў жыцці, адказу на пытанне "Як жыць?".

Вялікі агульначалавечы змест, усім сваім сацыяльным і маральным пафасам скіраваны на карысць людзей, здолеў убачыць у тагачасных падзеях пісьменнік. "Палеская хроніка" ўспрымаецца як велічная і праўдзівая эпапея народнага жыцця, напоўненага патрыятычным пафасам: "*Хай будзе, што будзе – толькі там быць, хадзіць па сваей зямлі, чуць яе пад нагамі, дыхаць яе пахам... хай хоць што, толькі тут быць! Толькі тут!*"

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Бугаёў, Д. Вернасць прызванню. Творчая індывідуальнасць Івана Мележа / Д. Бугаёў. – Мінск : Маст. літ., 1977.
2. Мележ, І. П. Збор твораў : у 10 т. / І. П. Мележ. – Мінск : Маст. літ., 1979–1985. – Т. 8 : Жыццёвыя клопаты : арт., эсэ, інтэрв'ю. – 1983. – 686 с.
3. Мележ, І. П. Збор твораў : у 10 т. / І. П. Мележ. – Мінск : Маст. літ., 1979–1985.
4. Мележ, І. П. Людзі на балоце / І. П. Мележ. – Мінск : Нар. асвета, 1977. – 380 с.